*ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ВЫДАЕЦЦА З 1 МАЯ 1935 г.

1980 г.
21
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 6 (1270)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ДА 110-й ГАДАВІНЫ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА.

## ПЕРАКЛІЧКА ФАКУЛЬТЭТАЎ

### ГЕАФАК

Ленінскі ўрок «Па-ленінску вучымся камунізму, будуем камунізм», на якім камсамольцы яшчэ і яшчэ раз вяртаюцца да ленінскай спадчыны, параўноўваюць свае справы і думкі з запаветамі правадыра, праходзіць зараз на факультэце. Камсамольцы ўсіх груп актыўна рыхтуюцца да правядзення Ленінскага заліку і грамадска-палітычнай атэстацыі. Усе гэтыя мерапрыемствы завершацца напярэдадні 22 красавіка Ленінскай паверкай.

### ХІМФАК

Як і ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях, на хімфаку праходзіць III этап Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!», прысвечанага 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. У ходзе яго шырока разгарнулася вывучэнне камсамольцамі і моладдзю жыцця і рэвалюцыйнай дзейнасці У. І. Леніна, яго твораў, дакументаў і матэрыялаў з'ездаў КПСС. Праводзяцца чытанні «Справа Леніна жыве і перамагае», арганізуюцца сустрэчы моладзі з ветэранамі партыі і камсамола, героямі вайны і працы, кавалерамі ордэна Леніна, маладымі гвардзейцамі пяцігодкі.

### МЕХМАТ

Камітэтам камсамола факультэта распрацаваны графік правядзення Ленінскага ўрока, які на высокім узроўні ўжо прайшоў на II і III курсах. У ходзе яго абмяркоўваецца пастанова ЦК КПСС «Аб 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна». Вядзецца вялікая работа па падрыхтоўцы да грамадска-палітычнай атэстацыі і правядзенні Ленінскага заліку. Створаны камісіі па ГПА, арганізавана вучоба камсамольскага актыву факультэта. Актыўны ўдзел прымуць студэнты ў камуністычным суботніку, які будзе прысвечаны юбілею, шэраг камсамольскіх арганізацый патокаў абавязаліся сабраць і перадаць падшэфнай школе і ГПТВ № 114 ленінскую бібліятэчку. Афармляюцца стэнды аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна.

### ФІЗФАК

Дастойна сустракаюць 110-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна фізікі. На камсамольскіх сходах студэнты сустракаюцца з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, працы, знаёмяцца з творамі вялікага правадыра. На факультэце працуюць тэматычныя юбілейныя выстаўкі. Нядаўна ў інтэрнаце № 5 быў праведзены суботнік, у якім прымалі ўдзел савецкія і замежныя студэнты. Арганізуюцца выезды з канцэртамі, выступленні агітбрыгад у падшэфных школах Уздзенскага раёна. Кіраўнікамі факультэцкай дыскатэкі намечана правесці вечар дыска-клуба на тэму «У. І. Ленін і музыка».

### БІЯФАК

«Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» — пад такой назвай праходзіла алімпіяда на біялагічным факультэце, прысвечаная 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Пераможцамі I тура алімпіяды прызнаны: Камара Сунуку, студэнтка IV курса (кафедра мікрабіялогіі), А. Мірашнічэнка, студэнтка V курса (кафедра біяхіміі).

## 23 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ



*Юлия Друнина*

*Пусть были тревожны*
*сводки —*
*Светили в ночи тогда*
*Мне звездочка на пилотке,*
*На башне Кремля звезда.*
*И, стиснув до хруста зубы,*
*Я шла по Большой Войне,*
*Пока не пропели трубы*
*Победу моей стране.*

*Три с лишним десятилетья*
*Уже не грохочет бой.*
*Но с прежнею силой светят*
*Те звезды в ночи любой —*
*На башне и на пилотке.*
*Их светом озарены,*
*Мне в сердце приходят сводки*
*С далекой Большой Войны.*

## НАВІНЫ БДУ

### АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭННЕ

**прэзідыума прафкома, на якім прысутнічалі старшыні прафбюро факультэтаў і падраздзяленняў. На пасяджэнні былі разгледжаны пытанні аб рабоце прафсаюзнай арганізацыі гаспадарча - адміністрацыйнай часткі, аб паляпшэнні абслугоўвання чытачоў калектывам бібліятэкі. Па другому пытанню выступілі дырэктар бібліятэкі І. У. Арахоўская і член мясцкома В. І. Яйсо. У прынятай па гэтаму пытанню пастанове ўказаны тыя меры, якія павінны быць прыняты дырэкцыяй бібліятэкі для паляпшэння абслугоўвання чытачоў. Гэта, у прыватнасці, далейшае выкарыстанне сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі, захоўванне кніг пры аптымальным тэмпературным рэжыме, расшырэнне сувязі бібліятэкі з факультэтамі, інфармаванне студэнтаў і супрацоўнікаў аб той або іншай літаратуры для найбольш поўнага яе выкарыстання.**

### ПЕРШЫНСТВО Ў СПАБОРНІЦТВЕ

**па праграме агульнауніверсітэцкай спартакіяды «Здароўе» трымае калектыў вылічальнага цэнтра. У спартакіядзе, у рамках якой будуць праведзены турніры па шахматах, валейболу, баскетболу, стральбе і іншых відах спорту, удзельнічаюць каманды супрацоўнікаў факультэтаў, лабараторый і навуковых устаноў універсітэта. На днях удзельнікі выйшлі на лыжную трасу. Спаборніцтвы былі праведзены ў дзвюх узроставых групах. У першай групе сярод мужчын перамог супрацоўнік НДІ ФХП А. Паўлаў, у другой — кандыдат фізіка-матэматычных навук А. Кузнечык. Сярод жанчын лепшыя вынікі паказалі А. Шантрукова і С. Грабянок. У агульнакамандным заліку першынствавала каманда супрацоўнікаў вылічальнага цэнтра, якую ўзначальвае Л. Кагановіч.**

### ЦІКАВУЮ РАБОТУ

**вядзе савет дружбы універсітэта. У яго састаў уваходзяць прадстаўнікі ўсіх зямляцтваў, якія навучаюцца ў БДУ. На днях прайшло чарговае пасяджэнне савета, на якім былі абмеркаваны арганізацыйныя пытанні і план работы на другое паўгоддзе. Новым старшынёй савета дружбы выбрана Першынг Сайд, студэнтка II курса журфака.**

**Хутка пройдзе Міжнародны дзень салідарнасці ў барацьбе супраць каланіялізму. У гэты дзень на філфаку адбудзецца вечар замежных студэнтаў, на які запрошаны прадстаўнікі падрыхтоўчага факультэта. Будуць паказаны нумары мастацкай самадзейнасці, арганізаваны конкурс палітычнага плаката.**

# У абстаноўцы адзінства і згуртаванасці

**СУСТРЭЧА ВЫБАРШЧЫКАЎ З КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ**

АБ ГАРАЧЫМ адабрэнні ўнутранай і знешняй палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы, імкненні дастойна сустрэць 110-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна гаварылі ўдзельнікі сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР — рэктарам Белдзяржуніверсітэта, віцэ-прэзідэнтам АН БССР, акадэмікам АН БССР Уладзімірам Аляксеевічам Белым.

Давераная асоба кандыдата ў дэпутаты дэкан хімічнага факультэта В. Ф. Цікавы расказаў аб жыццёвым шляху, працоўнай і грамадскай дзейнасці У. А. Белага.

У сваіх выступленнях доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар У. Р. Барышэўскі, доктар філалагічных навук, прафесар А. В. Лойка, студэнтка IV курса фізічнага факультэта А. А. Шамянкова і іншыя адзначылі вялікі ўздым у калектыве, выказалі шчырую падзяку за пастаянную ўвагу, якую праяўляе У. А. Белы, аб далейшым развіцці універсітэта.

З прамовай выступіў цёпла сустрэты выбаршчыкамі У. А. Белы. Ён адзначыў тыя эканамічныя і сацыяльныя рубяжы, якіх дасягнула рэспубліка і ўся наша краіна з часу мінулых выбараў, расказаў аб поспехах калектыву універсітэта і перспектывах яго далейшага развіцця. Пазнаёміў прысутных з тымі пытаннямі, якія абмяркоўваліся на нядаўняй нарадзе работнікаў вышэйшай школы ў Маскве.

Сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, рэктарам БДУ імя У. І. Леніна, акадэмікам АН БССР У. А. Белым прайшла ў сардэчнай абстаноўцы.

**Наш кар.**



**У кожнага з гэтай групы студэнтаў другога курса фізічнага факультэта свае планы і імкненні, клопаты і патрабаванні, пошукі і знаходкі. А вось сёння, імена зараз, іх зацікавіла лекцыя «Метады аналітычнай фізікі».**

Фота **М. Дубовіка.**

# КАЛІ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА МАРЫ

ЧАЛАВЕК па натуры сваёй — летуценнік. У марах дасягае ён далёкіх сузор'яў, адкрывае невядомыя астравы, вырашае сусветныя праблемы. Для адных мары — прыгожы свет, у якім адпачывае стомленая ў буднях душа, другім яны дапамагаюць знайсці свой шлях, зрабіць правільны крок, паставіць перад сабой дасягальную мэту. У Мікалая Міхайлавіча Азаркі, аднаго з лепшых шафёраў гаража БДУ імя У. І. Леніна, запаветныя жаданні сталі вехамі жыцця.

З дзяцінства Коля марыў стаць шафёрам, самастойна вадзіць машыну. Цягнула хлопца рамантыка далёкіх дарог. Закончыўшы дзесяцігодку, ён цвёрда рашыў авалодаць любімай прафесіяй. Пасля сканчэння аўтаклуба некаторы час працаваў у родным калгасе.

Затым нялёгкія салдацкія дарогі. Калёсамі аўтамашыны Мікалай Азарка адмераў шмат кіламетраў. У 1971 годзе вярнуўся дадому, у вёску. Папрацаваўшы два гады ў калгасе, ён вырашыў паехаць у Мінск. Прыйшоў працаваць у гараж універсітэта.

У 1975 годзе даверылі Мікалаю Міхайлавічу новенькі аўтобус «ПАЗ». Цяпер на спідометры яго аўтобуса стаяць лічбы: 150 тысяч. Гэта вымераныя ў кіламетрах пяць гадоў напружанай працы, радасці і няўдачы, недаспаныя ночы, час, аддадзены любімай справе. Імена сваёй бескарыснасцю, сваімі ведамі, якімі ён шчодра дзеліцца з моладдзю, і заслужыў Мікалай Міхайлавіч тую павагу і цёплыя словы, што сказаў пра яго начальнік гаража В. С. Казлоў:

— Мікалай — добры спецыяліст, выдатны работнік. Заўсёды выконвае ўсё, што ні даручыш, дапамагае маладым, заўсёды падкажа, як зрабіць тую або іншую справу. Зараз Мікалай возіць у прафілакторый студэнтаў. За ўвесь час работы не было ніякіх нараканняў з боку адміністрацыі, пасажыраў і ДАІ. Ужо другі год Мікалай з'яўляецца дружыннікам-аўтаінспектарам. За выдатную працу ён неаднаразова прэміраваўся, а ў 1978 годзе яму было прысвоена званне «Ударнік камуністычнай працы».

Шмат займаецца ён і грамадскай работай. Ужо каторы раз выбіраецца прафгрупоргам і выдатна спраўляецца са сваімі абавязкамі. Усё гэта яшчэ і яшчэ раз пацвярджае думку аб тым, што Мікалай Міхайлавіч Азарка знайшоў свой шлях у жыцці, правільна выбраў прафесію.

**А. КОЗЕЛ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

**З НАШАЙ ПОШТЫ**

# АГУЛЬНАЯ МЭТА

СТУДЭНЦКАЯ навукова-даследчая работа з'яўляецца адной з найбольш важных у працэсе падрыхтоўкі маладога спецыяліста. А для нашага аддзялення філасофіі яна іграе асобую ролю, якая вызначаецца тым, што ў будучым нас чакае выкладчыцкая ці даследчая работа ў галіне марксісцка-ленінскай філасофіі і прыкладной сацыялогіі. Таму жыццёва неабходна яшчэ на студэнцкай лаўцы авалодаць навыкамі навукова-даследчай работы, навыкамі навуковай арганізацыі разумовай працы.

Неабходна з першага дня знаходжання студэнта ва універсітэце фарміраваць у яго дакладную арыентацыю на ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Асноўную ролю ў гэтай справе павінны сыграць студэнцкія калектывы, арганізатары студэнцкай навуковай работы ў саветах СНТ і камсамольскіх бюро, аспіранты і выкладчыкі. Неабходна толькі накіраваць сумесныя намаганні на фарміраванне і падтрымку добрых пачынанняў і традыцый у студэнцкай навуцы.

Вось ужо некалькі гадоў у пачатку новага навучальнага года для студэнтаў першага курса аддзялення філасофіі праводзяцца гутаркі аб студэнцкай навукова-даследчай рабоце, аб прынцыпах навуковай арганізацыі разумовай працы.

Значнае месца ў жыцці нашага аддзялення займае работа студэнцкіх навуковых гурткоў. У гэтай сувязі хочацца асабліва адзначыць гурток «Філосаф» пры кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў. На пасяджэнне гуртка прыходзяць не толькі студэнты-філосафы, але і студэнты іншых факультэтаў універсітэта. Гурток падтрымлівае традыцыйныя сувязі са студэнцкім навуковым гуртком медыцынскага інстытута.

Студэнты філасофскага аддзялення прымаюць актыўны ўдзел у штогадовай навуковай канферэнцыі, прысвечанай жыццю і дзейнасці У. І. Леніна. Хацелася б, каб настолькі ж актыўным быў удзел і ў конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

Студэнцкая навуковая работа нашага аддзялення, яе поспехі і яе праблемы знаходзяць сваё адлюстраванне ў насценгазеце «Логос» і бюлетэнях гурткоў.

**В. СІВІЦКАЯ,**
**член савета СНТ гістарычнага факультэта, студэнтка IV курса аддзялення філасофіі.**



# АДМЕТНАЯ РЫСА

МЫ СТАІМ ля Дошкі гонару універсітэта. На ёй — фатаграфіі выдатнікаў вучобы. На адным з фотаздымкаў — партрэт дзяўчыны. Марына Кузняцова — студэнтка трэцяга курса механіка-матэматычнага факультэта, педагагічнага патока. Пайшлі на факультэт. Пазнаёміліся, разгаварыліся...

Перш за ўсё Марына запэўніла нас, што ў яе біяграфіі няма нічога незвычайнага. Але той факт, што яна, дзевятнаццацігадовая дзяўчына, вылучана кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага раённага Савета народных дэпутатаў, гаворыць сам за сябе.

**— Марына, калі ў цябе пачалося захапленне матэматыкай! Што зрабіла ўплыў на твой выбар!**

— Я, як кажуць, нарадзілася ў «матэматычнай сям'і». Мой дзед, бацькі, старэйшая сястра — матэматыкі па прафесіі, з дзяцінства імкнуліся зацікавіць мяне гэтай «сухой», з пункту гледжання многіх, навукай. Ішоў час, і я зразумела, што матэматыка — гэта «мая» прафесія. Выбрала педпаток.

— Калі стала займацца грамадскай работай? Даўно. Яшчэ ў школе была адказнай за ідэалагічны сектар у камітэце камсамола.

Вопыт арганізатара вельмі спатрэбіўся на першых сельгасработах. Менавіта тут, у час, калі вызначаецца месца кожнага ў студэнцкім калектыве, Марына заваявала аўтарытэт і павагу аднакурснікаў. Таму на першым жа камсамольскім сходзе таварышы выбралі яе прафоргам. Адначасова з'яўлялася членам штаба «Камсамольскага пражэктара», а з пачатку гэтага года — яго старшынёй і членам камітэта камсамола факультэта.

Марына не ведае, што такое сум і адзінота. Яна заўсёды сярод таварышаў, душа любога мерапрыемства ў групе. Ужо двойчы за час вучобы дзяўчына працавала ў Малдавіі ў саставе будатрада мехмата. І тут яна не засталася ў баку ад жыцця калектыву. Намаганнямі Марыны ў падшэфнай школе быў афармлены кабінет геаграфіі. Ёсць у яе планы і на гэтае лета — яна едзе з СБА у Карэлію.

— Калі Марына штосьці паабяцае, то абавязкова зробіць. Гэта — яе адметная рыса характару,— гаворыць пра сяброўку Таня Ярашэвіч, камсорг групы. Яна паказала нам асабістыя комплексны план Марыны. З кожнага яго радка праглядвае імкненне да ўдасканалення сваіх ведаў, стараннасць, дапытлівасць.

У гэтым годзе Марына ў саставе студэнцкай дэлегацыі Белдзяржуніверсітэта паедзе на практыку ў Балгарыю. Ужо цяпер яна вывучае гісторыю народнай асветы рэспублікі, што з'явіцца асновай для напісання навуковай працы «Параўнальная характарыстыка савецкіх і балгарскіх падручнікаў».

...Ідзе сустрэча кандыдатаў у дэпутаты са сваімі выбаршчыкамі. Выступленні, наказы, пажаданні... На трыбуне — выбраннікі народа. І сярод іх — маладая дзяўчына, студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Марына Кузняцова.

**Т. НАРКЕВІЧ,**
**Л. ТУРБАЛ.**

# ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

**«КАНТРАСТЫ АДНОСІН» — так называўся артыкул, які быў змешчаны 31 студзеня 1980 года. У ім падвяргалася крытыцы работа рэдкалегіі насценнай газеты хімічнага факультэта. Рэдакцыя атрымала адказ за подпісамі сакратара партбюро і рэдактара газеты «Хімік». У ім паведамляецца, што, нягледзячы на кароткі тэрмін работы новага саставу рэдкалегіі, газета мае свае станоўчыя бакі.**

**Разам з тым у дзейнасці рэдкалегіі ёсць і значныя недахопы. Але якасць апошніх нумароў газеты значна палепшылася. Зараз планы рэдкалегіі накіраваны на тое, каб зрабіць газету «Хімік» больш баявой. Для гэтага рыхтуюцца праблемныя матэрыялы.**

**Дапамогу рэдкалегіі аказваюць дэканат, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі. Усе гэтыя намаганні павінны прывесці да таго, каб «Хімік» адпавядаў патрабаванням часу.**

# СЛАВА САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОМУ ФЛОТУ!

ПАЛИ ЦЕЛЫЕ ПОКОЛЕНИЯ ГЕРОЕВ. ПОЛЮБИТЕ ХОТЯ БЫ ОДНОГО ИЗ НИХ, КАК СЫНОВЬЯ И ДОЧЕРИ, ГОРДИТЕСЬ ИМ, КАК ВЕЛИКИМ ЧЕЛОВЕКОМ, КОТОРЫЙ ЖИЛ БУДУЩИМ. КАЖДЫЙ, КТО БЫЛ ВЕРЕН БУДУЩЕМУ И УМЕР ЗА ТО, ЧТОБЫ ОНО БЫЛО ПРЕКРАСНО, ПОДОБЕН ИЗВАЯНИЮ, ВЫСЕЧЕННОМУ ИЗ КАМНЯ...

Юлиус ФУЧИК.

НАШЫ ВЕТЭРАНЫ

## ВЫЗВАЛЕННЕ

**АДЗІН ЭПІЗОД З ГЕРАІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАДПОЛЬШЧЫКА**

ЧАСТА забягаюць студэнты ў кабінет фотарэпартажа, што на чацвёртым паверсе журфака. Не толькі першакурснікі, каб атрымаць залік па выкананаму заданню. Прыходзяць старшакурснікі:

— Георгій Захаравіч, можна плёнку праявіць?..

— Георгій Захаравіч, ці можна папрацаваць у лабараторыі?..

Працуе Георгій Захаравіч Бягун загадчыкам кабінета фотарэпартажа ўжо шмат гадоў. Ён ветэран вайны, але не ўсе ведаюць, праз якія выпрабаванні ён прайшоў.

У гады вайны Георгій Захаравіч быў членам падпольнай групы «Артур», якая займалася зборам звестак аб ворагу ў Мінску, карала фашысцкіх злачынцаў і іх паслугачоў. У Мінску і вобласці існавала цэлая сетка разведчыкаў, якія строга прытрымліваліся канспірацыі. Але не драмаў і вораг. Пасля забойства Кубэ фашысты яшчэ больш азвярэлі. Не вярнуліся людзі, якіх пасылалі на сувязь.

У горад пайшоў Георгій Бягун. Паспяхова мінуў нямецкія пасты. У горадзе засталася знаёмая настаўніца. У яе і пасяліўся Георгій. Некалькі дзён не выходзіў з дому для канспірацыі. Потым пачаў дзейнічаць. Георгій пабываў на дзвюх явачных кватэрах, даведаўся аб арышце сувязной. Засталося яшчэ адно месца...

На вуліцы жанчына мыла бялізну. Разведчык прайшоў раздругі. Сталетнік (умоўны знак) — на месцы. У хаце — некалькі пытанняў для праверкі, і пачалася размова. Стол накрыты, закіпеў чай. Гаспадар падняўся за чымсьці, і тут Георгій убачыў пісталет.

«Чаму ён такі насцярожаны, чаму зброю носіць? Мабыць»... — пранесліся думкі.

Георгій ускоквае з-за стала, але нічога не паспявае зрабіць.

— Рукі ўверх, шчанюк!

«Гасцінны» гаспадар пазваніў у жандармерыю. Чакалі не доўга. Георгія ўпіхнулі ў машыну і павезлі. Спыніліся каля аднаго дома, дзе гулялі фашысты. Зайшлі, каб запытацца, што рабіць з бандытам. Раптам усё змоўкла, п'яныя ўбачылі новую забаву: нажы, вілкі, аб'едкі паляцелі ў разведчыка. Хутка і гэта надакучыла, яны зноў пачалі весяліцца...

Затым было Смаленскае СД. Кожны дзень допыты, катаванні. Георгій паўтараў: «Я селянін, пайшоў у Мінск, бо ў лесе мяне сустрэлі нейкія людзі, забралі каня...».

Праз некаторы час Георгія адпраўляюць у памяшканне ўнутранай турмы. Там былі тыя, каму ўжо не суджана жыць. Неяк вечарам уварваліся гестапаўцы ў камеру і пачалі выпіхваць на двор. Там чакала машына. Іх грузілі, як дровы, хто не хацеў лажыцца, валілі хлыстом.

Зноў знаёмыя вуліцы. Мінская турма. Толькі паўтара месяца прабылі там асуджаныя на смерць. Іх павезлі ў Трасцянец...

Вязняў зачынілі ў бараку, які быў укапаны ў зямлю. Тут ужо было шмат людзей — мужчын, жанчын і дзяцей. Тут жа сустрэў Георгій сваіх сяброў, даведаўся пра іх правалы на явачнай кватэры. Тут жа пакляліся, што калі хто-небудзь застанецца жывы, раскажа праўду родным...

...Лязгнуў ключ, увайшлі фашысты. Людзі зразумелі — гэта смерць, адступалі ад дзвярэй. Падняўся крык і плач. Людзей выганялі хлыстамі. Паехала першая машына, затым — другая, трэцяя...

Георгій сеў пад нары. Дваццаць адзін год. Яшчэ так мала пражыта, так не хочацца паміраць. Успомніў маці.

...Вясковая хата. Мароз размаляваў шыбы. Маленькі Жора падыхаў на іх: цікава, што на вуліцы. А маці шые і спявае пра катаржаніна, які ламае печ, вылазіць на страху, спускаецца па канатах...

Немцы забіраюць усё новых і новых людзей, застаецца зусім мала. Раптам маланкай праносяцца думкі: печ, трубы, лаўка... Трубы нагадвалі паліцы, там і схаваўся Георгій. Выводзяць апошніх і... цішыня. Што будзе заўтра? Прыйдуць новыя смертнікі і ўсё спачатку?.. Выцягнуў заслонку і пачаў разбіваць дымаход. Над Георгіем уверсе было неба з далёкімі зоркамі. Дабраўся да страхі, скаціўся на зямлю. А вакол — калючы дрот.

Спачатку поўз, затым бег невядома куды, а калі пачало святлець, сарыентаваўся і паплыў па цячэнню Трасцянкі. Выбраўся праз балота да лесу. Георгій рваў асаку і прагна глытаў саладкаватыя карэньчыкі. Ісці не было сіл. Раптам убачыў след стаянкі гітлераўцаў, салому. Зарыўся туды і заснуў. Пасля адпачынку ісці стала лягчэй. Неўзабаве Георгій убачыў невялікую вёску. Там былі савецкія людзі...

**Л. ТРАПЕЗНІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

## Вобраз савецкага салдата

НА ГІСТАРЫЧНЫМ факультэце прайшла канферэнцыя чытачоў, прысвечаная 35-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яна была праведзена па кнігах С. А. Аслёзава «Взрыв на рассвете» і «Если не мы, то кто же?».

З уступным словам выступіў кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. В. Марчанка. Сваімі ўспамінамі з чытачамі падзяліліся ўдзельнікі падзей, якія апісаны ў кнігах, — камандзір брыгады імя Ракасоўскага А. В. Раманаў, начальнік Дома ДТСААФ, генерал-маёр П. М. Машэраў, генерал-маёр, намеснік камандзіра брыгады па разведцы Г. І. Казарцаў, намеснік камандзіра атрада імя Шчорса Н. В. Бусько.



Са словам у адказ выступілі студэнты гістфака Б. Баннікаў, І. Велічанскі, З. Мельнік. Аб сваёй працы над кнігамі расказаў пісьменнік С. А. Аслёзаў. У канферэнцыі прымала ўдзел рэдактар выдавецтва «Палітычная літаратура» Ю. І. Харчанка.

Канферэнцыя была арганізавана бібліятэкай універсітэта і гістарычным факультэтам.

**А. СТАДУБ.**
**Фота аўтара.**



ГРУПА «ПОШУК»

## НЕ БЫЛО НЕВЯДОМЫХ ГЕРОЯЎ...

ЗВЫЧАЙНЫ лісток. Нават можна мінуць, праглядаючы стосы папер, фотакартак, паштовак. На ім — некалькі радкоў:

...слова «Барыс» з пякучых іскраў,
З трывог, барацьбы, смяротнай раны,
З маёй тугі, глыбока схаванай.
Ты з бою падняўся, вярнуўся нібыта,
Мой родны брат нікім не забыты...

Словы да брата, пра брата, які не вярнуўся з вайны. Загінуў у жорсткім баі пад Ельняй зампаліт, студэнт III курса Мінскага юрыдычнага інстытута Барыс Каган. Не забыты родны брат Эдзі Агняцвет, як не забыты сотні імён.

Выпадкова трапіў да яе адзін з нумароў газеты, у якім расказвалася пра групу «Пошук» юрыдычнага факультэта. Там жа друкаваліся фотаздымкі мінулых гадоў. Неўзабаве на адрас групы прыйшло пісьмо. З гэтага пачалося знаёмства з паэтэсай, папоўніліся звесткі пра Барыса Кагана, чыё імя занесена на Дошку «Памяці выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў Мінскага юрыдычнага інстытута, загінуўшых у барацьбе з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Золатам напісаны на мармуровай дошцы васемнаццаць прозвішчаў. Дзесяткі імён, лёсаў знаходзяцца ў спісах, успамінах, на фотаздымках. Гэтаму папярэднічалі сотні пісем у розныя куткі нашай краіны, сустрэчы, успаміны — карпатлівая работа.

Па прапанове прафесара І. І. Гарэліка (ён з'яўляецца кансультантам групы «Пошук») зараз рабяты збіраюць звесткі аб Якаве Мар'яхіне, Мікалаю Каржанеўскім, Анатолю Янушкевічу. Да 35-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне мяркуецца іх імёны занесці на Дошку памяці.

Група існуе чатыры гады. Многае зроблена, яшчэ больш трэба зрабіць. Даводзіцца працаваць у двух напрамках: шукаць новыя імёны і ў той жа час, папаўняць звесткі аб тых, чые імёны занесены на Дошку памяці.

На працягу некалькіх год члены групы збіраюць звесткі аб Марыне Малаковіч. Яна да пачатку вайны працавала на кафедры гісторыі партыі Мінскага юрыдычнага інстытута, а ў час вайны кіравала падпольнай групай у Калодзішчах. Аб жыцці Марыны Фядосаўны расказваецца ў кнізе «На 17-м кіламетры» Ус. Уладзімірава. Яе імя таксама занесена на Дошку памяці. Кожнае лета ў Малдавію выязджае будатрад імя Марыны Малаковіч. У пачатку студзеня прыйшло пісьмо з Масквы. «Для мяне дорага і свята, што ў Мінску памятаюць імя маёй маці. Дзякуй за памяць. Жадаю вам самага добрага...» Гэта радкі з пісьма дачкі Марыны Малаковіч. Зараз Ірына працуе карэспандэнтам «Піянерскай праўды», а яе брат — выкладчыкам Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Ламаносава. Такое пісьмо не адзінае.

Многае яшчэ трэба шукаць. Сувязь з Марынай Малаковіч мінскія падпольшчыкі трымалі праз урача медпункта ў Калодзішчах. Там жа працавалі дзве дзяўчыны...

Захоўваюцца студэнцкія і камсамольскія білеты тых, хто не вярнуўся слухаць лекцыі. Захоўваецца пісьмо, пажаўцелае ад часу. Яго пісаў бацькам Ф. С. Дашкоўскі. Ён загінуў пад Баранавічамі. Захоўваюцца фотаздымкі саракавых гадоў. На адным з іх — група студэнтаў. Першакурсніцы забыліся пацікавіцца, хто сфатаграфаваны. Звярнуліся да загадчыка кафедры крымінальнага права Івана Станіслававіча Цішкевіча. Ён нават не думаў, што дзесьці захаваўся здымак выдатнікаў па нямецкай мове. Пазнаў і сябе, тады дваццацігадовага юнака. Усе гэтыя рэліквіі з цягам часу стануць экспанатамі факультэцкага музея.

Праз гады дайшлі і жывуць словы Юліуса Фучыка: «Я хацеў бы, каб усе ведалі, што не было невядомых герояў, што былі людзі, у якіх было сваё імя, сваё аблічча, свае спадзяванні і надзеі. Аб адным прашу тых, хто перажыве гэты час: не забудзьце!..» Гэтыя словы сталі дэвізам работы групы «Пошук».

**І. МІХАЛОЎСКАЯ.**
**Б. ЯЎСЕЙЧЫК.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# П А Л А Ж Э Н Н Е

**АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ПРЫСВЕЧАНАГА 110-й ГАДАВІНЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА**

АГЛЯД мастацкай самадзейнасці праводзіцца рэктаратам, парткомам, прафкомам, камітэтам камсамола і праўленнем клуба універсітэта. Мэта і задачы:

— далейшае павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню рэпертуару, выканаўчага майстэрства самадзейных калектываў;

— далейшае развіццё самадзейнай мастацкай творчасці на факультэтах;

— прапаганда сродкамі мастацтва гістарычнага значэння Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі для беларускага народа і яго дасягненняў сумесна з іншымі народамі СССР у будаўніцтве камуністычнага грамадства, савецкага ладу жыцця, стваральнай працы і духоўнага багацця савецкіх людзей;

— павышэнне ўзроўню творчай і выхаваўчай работы ў калектывах мастацкай самадзейнасці;

— шырокая папулярызацыя дасягненняў самадзейнага мастацтва.

### УДЗЕЛ У АГЛЯДЗЕ І ЯГО ЎМОВЫ

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіцца ў актавай зале БДУ з 24 па 29 сакавіка.

**1. Факультэт прыкладной матэматыкі — 24 сакавіка ў 20.00.**

**2. Геаграфічны — 25 сакавіка ў 20.00.**

**3. Гістарычны—26 сакавіка ў 20.00.**

**4. Механіка-матэматычны — 26 сакавіка ў 18.00.**

**5. Факультэт журналістыкі — 27 сакавіка ў 20.00.**

**6. Юрыдычны — 27 сакавіка ў 18.00.**

**7. Філалагічны — 28 сакавіка ў 18.00.**

**8. Фізічны — 28 сакавіка ў 20.00.**

**9. Радыёфізічны — 29 сакавіка ў 18.00.**

**10. Хімічны — 29 сакавіка ў 20.00.**

**11. Біялагічны—25 сакавіка ў 18.00.**

Агляд-конкурс вакальна-інструментальных ансамбляў праводзіцца 22 сакавіка. ВІА прадстаўляюць праграму на 15—20 мінут. У залік канцэртнай праграмы ідуць балы, атрыманыя за два лепшыя нумары.

У аглядзе могуць прымаць удзел студэнты стацыянарнай і вячэрняй формы навучання. Дапускаецца ўдзел прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў у якасці салістаў.

Час конкурснай праграмы — 1,5 гадзіны.

Факультэту прадастаўляецца магчымасць правесці 2 рэпетыцыі ў актавай зале галоўнага корпуса, якія будуць працягвацца не больш 2-х гадзін. Праграму канцэрта ў 15 экземплярах неабходна прадставіць у праўленне студэнцкага клуба да 20 сакавіка.

Пры падвядзенні вынікаў агляду ўлічваецца шырыня ахопу розных жанраў і форм самадзейнай творчасці, прадстаўленых у канцэртнай праграме.

У журы агляду ўваходзяць прадстаўнікі грамадскіх і творчых арганізацый, кіраўнікі народных калектываў універсітэта.

Нумары мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца па 10-бальнай сістэме. Пры вывядзенні бала за нумар адкідваюцца максімальная і мінімальная ацэнкі. У залік ідуць ацэнкі за лепшыя 15 нумароў (з улікам выступлення ВІА). 16-ю ацэнку складуць балы за рашэнне конкурснай праграмы. Ацэньваючы канцэртную праграму, журы конкурсу ўлічвае: ідэйны і мастацкі ўзровень праграмы, прадстаўленасць жанраў і відаў самадзейнага мастацтва, выкананне конкурсных умоў, сцэнічную культуру, масавасць, складанасць рэпертуару, рэжысуру канцэрта.

### ЗААХВОЧВАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

Калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта, які зойме першае месца, узнагароджваецца пераходным кубкам прафкома універсітэта, Ганаровай граматай і грашовай прэміяй рэктарата ў размеры 200 рублёў.

Калектывы, якія зоймуць другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца ганаровымі граматамі і грашовай прэміяй рэктарата ў размеры адпаведна 100 і 50 рублёў.

### ЗАЦВЕРДЖАНЫ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕРАХОДНЫЯ ПРЫЗЫ:

— хараваму калектыву за выкананне твораў на патрыятычную і маладзёжную тэматыку (прыз камітэта камсамола);

— лепшаму калектыву за адлюстраванне студэнцкай тэматыкі (прыз прафкома);

— інструментальнаму калектыву за выкананне твораў беларускіх аўтараў (прыз рэктарата);

— за масавасць (прыз прафкома);

— узнагароджваюцца лепшыя чытальнікі, салісты-вакалісты, салісты-інструменталісты, танцоры (призы студэнцкага клуба).



**● НА КОНКУРС ●**

# Захапляючае падарожжа

МІНСК — Львоў — Ужгарад — Мукачава — Рахаў — Ярэмга —Чарнаўцы — Кішынёў—Мінск. Па такому маршруту праходзіла турысцкае падарожжа, у якім прынялі ўдзел пяцікурснікі пятай групы біялагічнага факультэта.

Сваімі ўражаннямі аб гэтым падарожжы, якое праходзіла восем дзён, дзеляцца яго ўдзельнікі.

**Іван Бяспалаў, староста групы:**

— Вось ужо тры гады наша група з'яўляецца адной з лепшых ва універсітэце. Назаву толькі некалькі прозвішчаў нашых выдатнікаў: Сяргей Гілевіч, Наталля Жук, Алег Мірашнічэнка і іншыя. Акрамя таго, Алег Мірашнічэнка з'яўляецца пераможцам Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс».

За перамогу ў сацыялістычным спаборніцтве на лепшую акадэмічную групу прафком БДУ імя У. І. Леніна і ўзнагародзіў нас турыстычнай паездкай па Заходняй Украіне і Малдавіі.

**Валянціна Суравежкіна:**

— Першы свой прыпынак мы зрабілі ў Львове. Гэта цудоўны старажытны горад. У ім шмат цікавых і прыгожых помнікаў. Запомніліся мне львоўскія музеі і асабліва унікальны музей-аптэка, пакуль што адзіны ў Савецкім Саюзе. У ім сабраны шматлікія лекавыя медыцынскія прэпараты, прылады, якімі карысталіся ў свой час нашы продкі.

Зусім нядаўна па тэлебачанню дэманстраваўся шматсерыйны фільм пра мушкецёраў. Таму для мяне было неяк незвычайна апынуцца на тых самых вуліцах і плошчах, дзе здымаўся фільм. Здавалася, я зноў убачу чатырох мушкецёраў з велізарнымі пер'ямі на шляпах і пачую знаёмую песню ў выкананні М. Баярскага.

Нельга не расказаць аб наведанні мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». І ўдзень і ўначы гарыць тут незгасальны Вечны агонь. У брацкіх магілах пахаваны савецкія воіны, вызваляўшыя Львоў. Тут пахаваны і вядомы разведчык, Герой Савецкага Саюза Мікалай Кузняцоў.

**Наталля Жук:**

— А мяне больш за ўсё уразілі Карпаты. Велічныя і незабыўныя. Колькі я чула аб іх, глядзела ў кіно, а сустрэцца з імі так блізка прыйшлося ўпершыню.

У невялікім закарпацкім гарадку Рахаў нашай групе нават прапанавалі ўзысці на адну з вяршынь гэтых цудоўных гор. І нягледзячы на тое, што яе вышыня была невялікай (640 метраў над узроўнем мора), нам было вельмі цяжка. Бо ніхто з нас ніколі не займаўся альпінізмам. Прыйшлося дапамагаць адзін аднаму. Узышлі ўсе. І ўжо там, на самым версе, мы адчулі сябе пераможцамі. Той, хто аднойчы бачыў горы, ніколі не зможа забыць іх.

**Валянціна Тарасевіч, прафорг:**

— Цяжка вылучыць з гэтай паездкі нешта адзінае. Мне падабалася ўсё: і прыгожы замак Паланак у Мукачаве, і ўжгарадскія старажытныя помнікі, і турыстычна-курортны цэнтр у Ярэмзе. Не забудзецца і наведанне савецка-румынскай граніцы.





Сталіца Малдавіі — Кішынёў. Гэта сучасны прыгожы горад з шырокімі вуліцамі і цудоўнымі плошчамі. Усяго сорак год назад была ўтворана Малдаўская ССР. Савецкая Малдавія сёння — гэта развітая рэспубліка з магутнымі прамысловымі комплексамі, высокамеханізаванай сельскай гаспадаркай, развітой культурай.

Кішынёў быў апошнім горадам нашага падарожжа па Карпатах і Малдавіі. У кожнага з нас застануцца ў памяці самыя прыемныя ўспаміны аб гэтым непаўторным кутку нашай краіны.

Карыстаючыся выпадкам я хачу выказаць удзячнасць рэктарату, камітэту камсамола, прафкому універсітэта за гэту незабыўную паездку.

**В. МАСКАЛЁЎ,**
**наш спец. кар.**

**НА ЗДЫМКАХ: студэнты-біёлагі ля Вечнага агню на могілках савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні Закарпацця ў 1944 г.; поезд прыбыў у горы; над горнай ракой.**

Фота **аўтара.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 15659 Заказ № 309.

21 лютага 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ